Магутны Божа

Муз. М. Равенскага

Словы Н. Арсеньнявай

ПАРЫЖ — 1947

ВЫДАНЬНЕ БЕЛАРУСКАЕ РЭЛІГІЙНАЕ МІСІІ

Магутны Божа



Магутны Божа! Ўладар сусьветаў,
Вялікіх сонцаў і сэрц малых!
Над Беларусяй, ціхай і ветлай,
Рассып праменьні свае хвалы.

Дай спор у працы штодзеннай, шэрай,
На лусту хлеба, на родны край,
Павагу, сілу і веліч веры
У нашу праўду, у прышласьць — дай!

Дай урадлівасьць жытнёвым нівам,
Учынкам нашым пашлі ўмалот!
Зрабі магутнай, зрабі шчасьлівай
Краіну нашу і наш народ!

Mahutny Boža! Ŭladar suśvietaŭ,
Vialikich soncaŭ i serc małych!
Nad Bielarusiaj, cichaj i vietłaj,
Rassyp pramieńni svaje chvały.

Daj spor u pracy štodziennaj, šeraj,
Na łustu chleba, na rodnyj kraj,
Pavahu, siłu i vielič viery
U našu praŭdu, u pryšłaść — daj!

Daj uradlivaść žytniovym nivam,
Učynkam našym pašli ŭmałot!
Zrabi mahutnaj, zrabi ščaślivaj
Krajinu našu i naš narod!